# БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ АТРАДА І. ШОХАВА Ў ВЕРХНІМ ПАДНЯПРОЎІ Ў ЧЭРВЕНІ–ЛІПЕНІ 1651 Г.

*К.І. Мяцеліца*
*Мінск, БелНДЦЭД*

Баявыя дзеянні атрада І. Шохава ў Верхнім Падняпроўі ў чэрвені –ліпені 1651 г. з'яўляюцца адной з самых таямнічых старонак казацка-сялянскай вайны. На дадзены момант у гістарыяграфіі не існуе ніводнага навуковай працы, якая была б адмыслова прысвечана гэтай падзеі, але чсткова яе абставіны разглядаліся гісторыкамі С. Чаропкай, К. Бабятынскім, Л. Абецэдарскім, В. Галабуцкім [1, 5, 9, 10]. Мэтай даследавання з'яўляецца рэканструкцыя і падрабязнае апісанне баявога рэйда казацкага атрада І. Шохава на завяршальным этапе казацка-сялянскай вайны на Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Асноўнымі матэрыяламі для напісання працы паслужылі такія крыніцы, як зборнікі дакументаў (АВАК, АЮЗР і інш) і дыярыўшы П. Абуховіча, С. Маскевіча і С. Асвенцыма [2–4, 6–8, 11, 12]. У працэсе даследавання былі выкарыстаны як агульнанавуковыя (апісанне, аналіз, сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-параўнальны, гісторыка-генэтычны) метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Актывізацыі паўстанцкага руху ў ВКЛ вясной 1651 г. спрыяла набліжэнне да Рэчыцкай павета Кіеўскага, Нежынскага і Чарнігаўскага палкоў. Гэтыя сілы павінны былі прыкрываць Украіну ад уварвання літоўскага войска гетмана польнага Я. Радзівіла [10].

Пасля некалькіх няўдалых сутычак на літоўска-ўкраінскай мяжы Б. Хмяльніцкі прыняў рашэнне распачаць баявыя дзеянні ў тыле літоўскіх войскаў. Для рэалізацыі гэтага плана казацкім загонам неабходна было прайсці па тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Верагодна, просьбу аб праходзе казацкага загону праз Бранскі павет Б. Хмяльніцкі перадаў праз маскоўскіх паслоў ў сакавіку 1651 г. У самым пачатку мая бранскі ваявода Д. Вялікі-Гагін атрымаў царскую грамату, якая дазваляла казакам ісці Бранскім уездам [4]. Магчыма, з боку цара Аляксея Міхайлавіча гэта быў своеасаблівы знак падзякі Б. Хмяльніцкаму, які адгаварыў крымскага хана ад нападу на Маскоўскую дзяржаву. Ускосныя звесткі пра гэта ўтрымліваюцца ў адным з сакавіцкіх лістоў Б. Хмяльніцкага цару [7].

У канцы красавіка – пачатку мая ў Пачэпе з'явіўся наказны Чыгірынскі палкоўнік І. Шохаў з атрадам у 4000 казакоў і 500 татар. У сярэдзіне мая Д. Вялікі-Гагін даў "памяць" мясцовым дваранам суправадзіць казацкі загон да маскоўска-літоўскай мяжы, але адмовіў у праходзе татарам. У пачатку чэрвеня бранскі ваявода атрымаў новую царскую грамату, якая адмяняла ранейшы дазвол на праход казакоў. Але загон І. Шохава ўсё роўна выступіў у паход на Рослаўль. С. Асвенцым меркаваў, што правалокі з пропускам казакоў былі звязаны са знаходжаннем у Маскве польска-літоўскіх паслоў [12]. Калі Аляксей Міхайлавіч даведаўся пра гэты інцыдэнт, ён адправіў Д. Вялікаму-Гагіну грамату з патрабаваннем растлумачыць сітуацыю, аднак той усё адмаўляў. Маскоўскім паслам у Рэчы Паспалітай было загадана спісаць усё на сваволю казакоў [4]. Тым не менш, згодна з С. Асвенцымам у Бранску загон І. Шохава праводзілі з вялікімі ўшанаваннямі [12].

У ноч з 15 на 16 чэрвеня атрад І. Шохава выправіўся ў паход і без бою заняў Рослаўль, дзе ўчыніў рабаванні і яўрэйскія пагромы [11]. У горадзе да загона І. Шохава далучыліся мяшчане і навакольныя сяляне – каля 1,5 тыс. чалавек [1]. У сваю чаргу С. Асвенцым пісаў, што ў гэты момант казацкі атрад налічваў ужо 7000 чалавек пры 7 лёгкіх гарматах [12]. П. Абуховіча пісаў, што ў атрадзе І. Шохава былі і "маскоўскія людзі" [13]. Яшчэ ў маі Д Вялікі-Гагін забараніў бранчанам далучацца да казакоў [4]. Вядомы некалькі выпадкаў, калі ён прасіў І. Шохава выдаць дваравых людзей бранскіх дваран, якія ўцяклі да казакоў [5]. Верагодна, некаторая колькасць бранчан сапраўды сышла на Рослаўль разам з казацкім загонам.

Навакольная шляхта збегла ў Смаленск, аднак у І. Шохава не было сілаў для штурма такога добра ўмацаванага горада. Казакі ў большай ступені разлічвалі на падтрымку жыхароў Падняпроўя. З'яўленне загону І. Шохава справакавала сялянскія хваляванні на Смаленшчыне. Не ў апошнюю чаргу гэта было звязана з працай казацкіх агітатараў, якія распускалі чуткі, быццам цар прыняў Б. Хмяльніцкага і ўсё Войска Запарожскае "под высокую руку" [6].

У Рослаўлі казацкі атрад падзяліўся на дзве групы – адна частка войскаў была накіравана пад Прудкі і Чэрэпаў, другая да Ельні і Дарагабужа. С. Асвенцым меркаваў, што пасля авалодання Дарагабужам І. Шохаў планаваў рухацца на Крычаў, Мсціслаў, Магілёў і Оршу і, атачыўшы гэтыя гарады, пайсці на Смаленск [12]. Пра лёс Дарагабужа няма ніякіх дакладных звестак акрамя таго, што пры атрыманні навін аб з'яўленні на Смаленшчыне казацкага загону, мясцовая шляхта адразу адабрала ў сваіх сялян усю зброю [5]. Мала што вядома і пра баявыя дзеянні пад Мсціслаўлем, які казакі безвынікова штурмавалі ў ліпені [1].

Куды больш звестак маецца пра аблогу Крычава. У абароне горада важную ролю адыграў крычаўскі староста М.С. Пац, які на ўласныя грошы ўзброіў гарнізон. Яшчэ ў красавіку ён пайшоў на шэраг істотных уступак сялянам, што дазволіла знізіць сацыяльную напружанасць у Крычаўскім староստве [6]. Пасля падыходу казакоў гарнізон Крычава паспяхова адбіваўся ад праўзыходных сіл праціўніка [2]. Абаронцы Крычава адбілі 7 штурмаў [12]. На выручку гораду былі пасланыя 600 чалавек пяхоты і 300 драгунаў падканцлера К.Л. Сапегі [8]. 2 ліпеня літоўскае войска разбіла паўтысячны казацкі раз'езд [12]. 4 ліпеня казацкі атрад быў канчаткова разгромлены. Пасля гэтага літоўскія харугвы рушылі на Рослаўль [8]. Па некоторых звестках да 19 ліпеня былі знішчаныя і тыя рэшткі казацкага загону, якія дагэтуль рассеяліся па наваколлі [11].

Да жніўня 1651 г. Верхняе Падняпроўе было практычна цалкам вычышчана ад казацка-сялянскіх атрадаў. Амаль аднačасова з бітвай пад Крычавам казакі пацярпелі паразы пад Берасцечкам і Лоевам, што цалкам абясцэніў рэйд І. Шохава.

**Заключэнне.** Кампанія 1651 г. на беларускіх землях звялася да няўдалых спроб казацкага камандавання перашкодзіць перасячэнню літоўска-ўкраінскай мяжы войскамі Я. Радзівіла. Ваенная абстаноўка вымусіла Б. Хмяльніцкага праз тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы накіраваць у тыл літоўскіх войскаў невялікі казацкі загон І. Шохава. Гэты атрад змог на некаторы час адцягнуць на сябе частку сіл Я. Радзівіла, аднак паражэнне асноўных сіл Б. Хмяльніцкага пад Берасцечкам і разгром М. Нябабы пад Лоевам нівеліравалі дасягненні атрада І. Шохава.

1. Абецедарский, Л.С. Белоруссия и Россия. Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII в. / Л.С. Абецедарский. – Мн.: Вышэйшая школа, 1978. – 256 с.
2. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией для разбора древних актов (АВАК). В 39 т. – Вильна, 1865-1915. – Т. 34. – Вильна : Электро-Тип. "Русский Почин", 1909. – 588 с.
3. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России (АЮЗР). В 15 т. – СПб., 1861–1892. – Т. 3. – СПб.: Тип. П.А. Кулиша, 1861. – 770 с.
4. Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы. В 3 т. / Ред. коллегия: П.П. Гудзенко и др. – М.: Изд-во АН СССР, 1953. – Т. 3. – 646 с.
5. Голобуцкий, В.А. Дипломатическая история освободительной войны украинского народа 1648–1654 / В.А. Голобуцкий. – Киев: Госполитиздат УССР, 1962. – 360 с.
6. Джерела з історії Національно-визвольної війни українського народу 1648–1658 рр. В 4 т. / Упор. Ю. Мицик. – Київ: Інститут української археографії та джерелознавства ім. М.С. Грушевського, 2012. – Т. 2. – 704 с.
7. Документи Богдана Хмельницького / Упор. І.Крип'якевич. – Київ: Вид-во АН УРСР, 1961. – 740 с.
8. Документы об освободительной войне украинского народа 1648–1654 гг. / Сост.: А.З. Барабой, И.Л. Бутич, А.Н. Катренко, Е.С. Компан. – Киев: Наукова думка, 1965. – 828 с.
9. Чаропка, С.А. Спробы рэанімацыі казацка-сялянскай вайны ў Беларусі вясной-летам 1651 г. / С.А. Чаропка // Науч. труды РИВШ: Истор. и псих.-пед. науки. Сб. науч. статей. Вып. 11. В 2 ч. Ч.1. – Мн., 2011. – С. 293–298.
10. Bobiatycki, K. W cieniu Beresteczka: dziaiania militarne armii litewskiej przeciwko Kozakom w 1651 roku / K. Bobiatycki // Przegl№d Historyczno-Wojskowy. – 2013. – Tom 14(65), Numer 3 (245). – S. 7-30.
11. Oњwiкcim, S. Dyaryusz 1643–1651 / S. Oњwiкcim. – Krakyw: Wyd. W. Chermak, 1907. – 427 s.
12. Pamiktniki Filipa, Michaia i Teodora Obuchowiczyw (1630–1707) / pod red. A. Rachuby. – Warszawa: DiG, 2003. – 640 s.

## ОБРАЗ ЖЕНЩИНЫ В ОККУПАЦИОННОЙ ПЕРИОДИЧЕСКОЙ ПЕЧАТИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (1941–1944 ГГ.)

*И.В. Николаева*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

В системе пропаганды, которая реализовывалась под нацистским контролем на оккупированной территории СССР, большое внимание уделялось организации и использованию периодической печати.

Цель настоящего исследования – охарактеризовать общие черты образа женщины, задаваемого германской властью, а также формы и способы его и трансляции со страниц оккупационной прессы, выходившей на территории Беларуси в 1941–1944 гг.



Репозиторий ВГУ